# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ '91

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР 24 СТУДЗЕНЯ

№ 2(1666)

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.


## ЧЫРВОНЫ РАДОК

**НА ФІЗІЧНЫМ** факультэце прайшла (апасенні кіраўніцтва, што народ не збярэцца, былі, на шчасце, дарэмнымі) прафсаюзная справаздачна-выбарная канферэнцыя. Старшынёй прафбюро абраны супрацоўнік кафедры тэарэтычнай фізікі Віталь Мікалаевіч Жылка.

* * *

«ЯКІМІ б цяжкімі ні былі сённяшнія часы, мы не павінны здраджваць традыцыі»,— лічыць прарэктар па міжнародных сувязях А. В. Шарапа. І сёлета на бераг возера Нарач накіравалася на адпачынак група замежных студэнтаў са сваімі выкладчыкамі-выхавацелямі. Праўда, замест ранейшых чатырох інтэрнацыянальны лагер адпачынку «Дружба» прыме толькі дзве змены навучэнцаў мінскіх ВНУ і тэхнікумаў (усяго каля сотні чалавек). Студэнтаў-замежнікаў чакае цікавы і змястоўны адпачынак: акрамя прыняцця лекавых паветраных ваннаў, настоеных на гаючых травах тутэйшых мясцін, ім прапануюць разнастайную культурна-масавую праграму.

## НАПЯРЭДАДНІ

# ПАДМУРАК ПОСПЕХУ

Кожны з нас, безумоўна, у першую чаргу думае пра «сваю кашулю». А давайце паспрабуем паставіць сябе на месца замежнага студэнта і ўявіць пачуцці чалавека, адарванага ад радзімы, сям'і. Магчыма, тады нашы сябры не скардзіліся б на непрыязныя адносіны да сябе з боку савецкіх студэнтаў.

Рэктарат, дэканат па рабоце з замежнымі студэнтамі, Мінскі гарадскі савет па справах замежных навучэнцаў спрабуюць акрэсліць кола пытанняў, якія, на іх думку, абавязкова будуць узняты на Усесаюзных справаздачна-выбарных канферэнцыях зямляцтваў навучэнцаў з Філіпін, Самалі і Амана, і старанна рыхтуюцца да іх. Менавіта з гэтай нагоды і сабраліся на днях прадстаўнікі зацікаўленых бакоў на нараду. Пытанні разглядаліся розныя: як правесці канферэнцыі на высокім навуковым узроўні, якім чынам забяспечыць ажыццяўленне інфармацыйнай, культурнай, экскурсійнай праграм, дзе размясціць і накарміць удзельнікаў? Здавалася б, дробязі, але без іх немагчыма плённая работа.



## АДДЗЯЛЕННЕ СУВЯЗІ

# Дазвольце авалодаць мовай!

Ад знаёмых беларусаў я часта чую, што яны ці наогул не ведаюць беларускай мовы, ці толькі разумеюць яе. Дома па-беларуску ніхто з іх не гаворыць, толькі старыя людзі ў вёсках яшчэ ўжываюць яе...

Таму замежнікам цяжка пазнаёміцца з сапраўднай, жывой беларускай мовай. І, тым не менш, сярод нас ёсць такія, хто хацеў бы вывучыць беларускую мову — каб глыбей ведаць жыццё, культуру, гісторыю і традыцыі вашага народа.

Дык чаму ж мы абмежаваныя ў гэтым, чаму не вывучаем беларускую мову? Здаецца, гэта вельмі лагічна — для тых замежных студэнтаў, хто некалькі гадоў жыве ў рэспубліцы, размаўляць на яе мове.

БССР для мяне такая ж паважаная, як і мая краіна. Таму валодаць беларускай мовай — значыць, мець дадатковае права і магчымасць выхоўваць у сабе нацыянальную годнасць.

Сярод іспанцаў ёсць такі народ — каталонцы. Яны жывуць на невялікай частцы тэрыторыі гэтай краіны, але акрамя іспанскай, маюць яшчэ ўласную мову, каталанскую. У савецкіх кнігарнях можна сустрэць руска-каталанскі слоўнік. У многіх краінах свету выдаюцца кнігі на гэтай мове. Чаму б не?

Не можа быць моў «паважаных» і «не паважаных». Таму я цалкам вітаю Закон БССР «Аб мовах у Беларускай ССР». Хачу часцей чуць гэтую мову і размаўляць на ёй.

Файмунда ЭВЕМБА,
студэнт 3-га курса
міжнароднага
аддзялення факультэта
журналістыкі.

## «ЧОРНЫ» СПІС

# Бібліятэчныя «доўгажыхары»

Не так ужо і многа сярод нас доўгажыхароў. Звычайна мы радуемся гэтым людзям, ганарымся імі. Але, на жаль, ёсць такія, што выклікаюць не надта радасныя пачуцці. Да такіх адносяцца, напрыклад, бібліятэчныя «доўгажыхары».

Яны трывала замацавалі свае пазіцыі і, па ўсім відаць, не думаюць адступаць перад націскам супрацоўнікаў універсітэцкай бібліятэкі. Вы памыляецеся, калі мяркуеце, што службовыя абавязкі апошніх — падбор і выдача па запатрабаванню наведвальнікаў літаратуры. Яны займаюцца яшчэ і... пошукам кніг.

Мы ўжо змірыліся са сваім лёсам і прымаем усё, як належнае. А інакш што рабіць? Не хадзі, не прасі, не вяртай кнігі на месца — і паліцы «кніжных храмаў» апусцеюць гэтак жа, як магазінныя. Дарэчы, ці не парадокс атрымліваецца. Калі чалавек возьме ў краме без дазволу карабок запалак і прадаўшчыца заўважыць гэта, яго абвінавацяць у крадзяжы. Калі ж з бібліятэкі, як кажуць, сярод белага дня выносяць кнігі і не вяртаюць іх — гэта проста забыўлівасць.

Не бяруся сцвярджаць, што такія злосныя намеры ва ўсіх нашых «старажылаў», аднак каб не сумняваліся ў вашай сумленнасці, паважаныя чытачы, перагледзьце свае ўласныя бібліятэкі і ўсё, што лішняе там, прынясіце да нас. Паспяшайцеся зрабіць гэта: Георгій Сяргеевіч Шулякоўскі, Уладзімір Міхайлавіч Барздоў, Віктар Савіч Адамчык, Уладзімір Сяргеевіч Кісялёў, Анатоль Уладзімімравіч Скачак, Іосіф Войцэхавіч Ліпніцкі, а таксама ўсе тыя, чыімі прозвішчамі спіс можна было б працягваць.

Ф. МІРУШЧАНКА.

## ПАСПРАБУЕМ?

# Нетрадыцыйнае выздараўленне

Сёння ўсе клапоцяцца пра наша здароўе: урачы, экстрасэнсы, псіхатэрапеўты, ведзьмакі... Але, на жаль, хворых не становіцца менш. Напэўна, мы самі недастаткова думаем пра сябе: кажуць, каб лячэнне дапамагло, важна настроіць свой арганізм на станоўчы вынік. Папрацуйце над сабой, паверце ў сілу лекара і... звяртайцеся ў прафсаюзнае бюро ўпраўлення.

«Няўжо ўжо і прафсаюзы ўзяліся за лекі?» — з жахам падумаеце вы. Пакуль не, але паколькі яны абавязаны клапаціцца пра наша з вамі здароўе, то прапануюць набыць абанементы на цыкл лекцый па псіхатэрапіі. Ды не проста лекцыі, а з лячэбна-аздараўленчымі сеансамі, якія праводзіць урач-псіхатэрапеўт вышэйшай кваліфікацыі, кандыдат медыцынскіх навук А. А. Галавач.

Усяго за дваццаць чатыры рублі (менавіта столькі каштуе абанемент) вы атрымаеце шанц пазбавіцца ад неўрозаў і радыкулітаў, міязітаў і вегетасасудзістай дыстаніі, болевых сіндромаў пры хранічных захворваннях.

Спяшаемся паведаміць: на сеансах будзе праведзена карэкцыя вашага біяполя і павышаны ўзровень самарэгуляцыі імунітэту.

Вас чакаюць у Доме палітасветы (вул. Кастрычніцкая, 5) у 18 гадзін 30 мінут 25 студзеня, 1, 8, 15, 22 лютага і 1 сакавіка.

# Вакол «Экала...»

Для больш эфектыўнай каардынацыі дзеянняў у галіне захавання прыродных рэсурсаў, падтрымкі якасці навакольнага прыроднага асяроддзя ў Мінск прыехала невялікая група германскіх эколагаў з мэтай заключэння двухбаковага пагаднення па абмену паміж маладымі спецыялістамі СССР і Германіі.

Прадстаўнік камітэта камсамола універсітэта Аляксей Багдановіч, удзельнік гэтай сустрэчы, прачытаў даклад на тэму «экалогія і моладзь», пасля якога доўгі час знаходзіўся пад «шквалам» роз-



набаковых пытанняў.

А. ГУСАК.
Фота аўтара.

## ПА САКРЭТУ УНІВЕРСІТЭТУ

# ПЕРАМАГЛА ЖАЛЕЗНАЯ ЛОГІКА

Студэнты, пачуўшы такую навіну, без сумнення, узрадуюцца. Яшчэ б! Каб трапіць на такі прэстыжны факультэт, як юрыдычны, ім не абавязкова было ўнікаць у паэзію лічбаў. На жаль, іх паслядоўнікам давядзецца цяжэй, бо ўжо ў гэтым годзе абітурыентаў-юрыстаў чакае экзамен па матэматыцы.

Якімі меркаваннямі кіраваліся члены вучонага савета універсітэта, прымаючы такое рашэнне?

— Улічваючы, што з году ў год конкурс на юрыдычны факультэт не зніжаецца, прычым, як паказвае практыка, не заўсёды сюды трапляюць па прызванню і лепшыя з лепшых абітурыентаў, члены вучонага савета сышліся на тым, што варта падумаць аб павышэнні аб'ектыўнасці ацэнкі ведаў паступаючых,— расказвае адказны сакратар прыёмнай камісіі А. П. Клішчанка.— «За» увядзенне экзамена па матэматыцы пры паступленні на юрыдычны факультэт быў і галоўны аргумент: юрысты павінны валодаць жалезнай логікай і ўмець дакладна дыферэнцыраваць факты. Новаўвядзенне дапаможа нам рабіць больш скрупулёзны адбор будучых студэнтаў.

Працягвае размову дэкан юрыдычнага факультэта В. М. Гадуноў.

— Прафесія юрыста непарыўна звязана з матэматыкай. Гэта і выкарыстанне ў працоўнай дзейнасці матэматычных метадаў, і пераход на камп'ютэрызацыю.

Да таго ж дакладныя навукі не паддаюцца ўздзеянню грамадска-палітычных сітуацый у краіне. Раней, здаралася, абітурыенты (ды і іх бацькі) на экзамене па грамадазнаўству абвінавачвалі нас у кансерватызме, маўляў, мы самі не ведаем, чаго хочам, і думаем старымі катэгорыямі. Яно то і на самой справе адбывалася штосьці падобнае, бо гістарычныя падзеі і з'явы рознымі даследчыкамі трактаваліся (няма дакладнай класіфікацыі і сёння) па-рознаму.

Ці будуць у сувязі з гэтым істотныя змены ў вучэбным плане? Думаю, не. Мы не вывучалі спецыяльных матэматычных дысцыплін і не маем намеру рабіць гэта (ва ўсялякім выпадку ў бліжэйшым будучым). Застануцца, па-ранейшаму, вучэбныя курсы, звязаныя з матэматыкай, напрыклад, судовая статыстыка. Так што веды па матэматыцы ў рамках школьнай праграмы студэнтам будуць як раз дарэчы.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

## «БЕЛАРУСКАЯ КНІГА-90»

# І МЫ НЕ ЛЫКАМ ШЫТЫ

**З 29 студзеня па 9 лютага гэтага года ў выставачнай зале Дома кнігі (пр. Машэрава, 11) упершыню ў Мінску праводзіцца справаздачная рэспубліканская выстаўка «Беларуская кніга-90».**

На ёй будзе прадстаўлена каля 1000 назваў кніг. Наведвальнікаў чакае знаёмства з вучэбнай, навукова-папулярнай, мастацкай літаратурай, каляндарамі, таварамі народнага спажывання, выдадзенымі рэспубліканскімі паліграфпрадпрыемствамі ў 1990 годзе. І не толькі азнаёміцца, але і набыць некаторыя з іх — на выставе плануецца арганізаваць шырокі продаж выданняў.

Выдавецтва «Універсітэцкае» прадставіць на выстаўку больш за 60 назваў кніг розных жанраў. Дарэчы, многія з іх напісаны выкладчыкамі БДУ імя У. І. Леніна. Сярод іх — «Прырода інтуіцыі» кандыдата філасофскіх навук І. М. Марозава, «Зборнік практыкаванняў па логіцы» пад рэдакцыяй доктара філасофскіх навук А. С. Кляўчэні, «Мадэлі масавага абслугоўвання ў сістэме апрацоўкі інфармацыі» кандыдата тэхнічных навук А. М. Ціханенкі, «Практыкум па атамнай фізіцы» пад рэдакцыяй акадэміка АН БССР Л. І. Кісялеўскага, «Методыка выкладання рускай мовы ў школах Беларусі доктара філалагічных навук Л. А. Мурынай і іншыя.

У. ПАБРЫЗГАЕЎ,
рэдактар па рэкламе выдавецтва «Універсітэцкае».

## Я МЯРКУЮ

# ВЕРНЕМСЯ ДА СВЯТА

«Рукапісы не гараць» — мудра вяшчуе выслоўе, і яно аднолькава тычыцца не толькі твораў канкрэтнага аўтара, але і творчасці народнай.

...Пярэдадзень Новага года для студэнтаў-першакурснікаў геаграфічнага факультэта быў адзначаны не толькі традыцыйнымі клопатамі заліковай сесіі, але і падрыхтоўкай да... Калядаў.

Першакурснікі не засталіся ў адзіноце. Дапамаглі і суполка ТБМ імя Ф. Скарыны, і агульнауніверсітэцкая кафедра беларускай мовы і літаратуры для прыродазнаўчых факультэтаў. Да свята таксама далучыліся універсітэцкі хор выкладчыкаў, самадзейны калектыў «Неруш». Дзякуючы добра распрацаванаму выкладчыцай беларускай мовы і літаратуры Л. У. Хрышчановіч сцэнарыю, дзея на сцэне не замкнулася ў вузкім коле самадзейных артыстаў, а непрыкметна запаланіла залу.

А колькі сілы, энергіі, ідэалагічнага запалу было патрачана ў свой час на вынішчэнне з людской памяці «рэлігійных забабонаў», а разам і свят, абрадаў, што вядуць сваё летазлічэнне яшчэ ад язычніцтва. Здавалася, назаўсёды змоўклі пад нашымі вокнамі песні валачобнікаў, пачалі затухаць агеньчыкі Купалля. Усё новыя пакаленні выраслі пад гучнымі лозунгамі Першамая і Кастрычніка — верылася: чалавек новай, камуністычнай маралі народжаны і расце!.. Але і гэты новы чалавек працягвае лаяцца і хуліганіць, красці і забіваць. А непераможна чырвоныя фарбы сацыялістычнай ідэалогіі пачалі блякнуць і адбіваюцца на нашых тварах адной толькі шэранню, бо аднастайнасць — яна і ёсць аднастайнасць.

«Хопіць балбатаць, працаваць трэба»,— часам пачуеш ад руплівцаў, ворагаў так званай «мітынговай дэмакратыі», але жыве ў народзе і такая прымаўка: усёй работы не пераробіш. Памятаецца, успамінала яе мама ў тых выпадках, калі бацька-атэіст браўся за работу ў нядзелю ці на якое царкоўнае свята, і з ціхай настойлівасцю дабівалася свайго. Гэта не толькі давала спачын целу, але напаўняла святлом, лагоднасцю, любоўю нашы душы. Сям'я адпачывала. І калі ёсць рацыя ў патрабаваннях зменшыць колькасць прамоў і пармоўцаў, то зрабіць гэта трэба не толькі на карысць працоўных будняў, але і святаў.

Сёння мы мусім прызнацца, што нашы «савецкія, сацыялістычныя святы» так і не прыдаліся, не здолелі вырасці з «чырвонага аркуша календара», з «выхаднога» ў сапраўднае свята (тое, што паходзіць ад «света» і ад «святога», калі ў корані не падзея, не чалавек з яго матэрыяльнымі клопатамі, а душа). Інакш кажучы, камуністычны светапогляд так і застаўся вузкапартыйным (пры ўсёй шматлікасці партыі), а мяжа паміж палітыкай і культурай народа, паміж розумам і сэрцам так і не была пераадолена.

Мы ўжо змірыліся з думкай, зразумелі, што 7 лістапада адным напамінае падзею радасную і светлую, другім жа — пра самы чорны дзень у нашай гісторыі, а для трэціх — гэта звычайны лішні выхадны. Адносіны да такога свята вызначаюць палітычную арыентацыю, грамадскую актыўнасць кожнага. Падобныя святы абвастраюць супрацьстаянне ўнутры грамадства, пры пэўным збегу акалічнасцей становяцца выбухованебяспечнымі, і таму недапушчальна акцэнтаваць на іх празмерную ўвагу.

Рэлігійныя святы на дадзены момант пазбаўлены палітычнай афарбоўкі і маюць значэнне агульнакультурнае, могуць стаць своеасаблівым кансалідуючым пачаткам у нашым неспакойным жыцці. Бо рэлігія — маці душы народа, і ставіцца да яе трэба як да маці: з разуменнем і павагай. А сваіх дзяцей добрая маці заўсёды здолее памірыць. Таму ўзрастанне цікавасці да забытых традыцый трэба не толькі ўхваляць, але і прапагандаваць, рэкламаваць іх. Фундатарамі і арганізатарамі не абавязкова павінны быць толькі святары ды вернікі, добры плён можа і павінна даць ініцыятыва актывістаў ад творчай інтэлігенцыі, выкладчыкаў, студэнцтва. Час перагледзець свае адносіны да «рэлігійных забабонаў» і камсамолу. Памылкі папярэднікаў трэба выпраўляць.

Многія з нас ужо і не ведаюць, калі і як трэба адзначаць тое ці іншае свята. Тут бы дарэчы аўтарытэтна і ў займальнай форме даць напярэдадні адпаведную інфармацыю па тэлебачанні і радыё, зрабіць рэкламны ролік і пракручваць яго перад найбольш папулярнымі перадачамі. Далучыліся б і газеты. Глядзіш, і пасвятлелі б нашы душы, не так прыгнечвалі клопаты будняў, прыбыло б цяпла, добразычлівасці ў вачах і сэрцах людзей. Пакуль жа зацікаўленым даводзіцца даходзіць да ўсяго саматугам.

...Свята на геафаку ўдалося, і можа б не варта пра яго згадваць, але яно апошняе толькі для старога года, а за вакном год новы. Святы будуць і ў ім — не спахапіцца б на апошнім...

П. НАВОЙЧЫК,
выкладчык.

## ЯК ГЭТА БЫЛО...

# «Папяровая» беларусізацыя

Цяжкае становішча з мовай і ўвогуле з культурай беларускага народа ў 20-я гады вельмі негатыўна паўплывала на яго нацыянальную свядомасць, на міжнацыянальныя адносіны ў рэспубліцы. Надзвычай неабходна было як мага хутчэй надаць беларускай мове статус дзяржаўнай, а таксама ўвесці яе ў розныя ўстановы, шырока разгарнуць выданне кніг, часопісаў, газет...

Сістэматычна, на ўзроўні дзяржаўнай палітыкі ў межах БССР, беларусізацыя праводзілася з 1924 года. Аднак і ў папярэднія гады ў некаторых установах ажыццяўляліся тыя мерапрыемствы, якія ў далейшым атрымалі назву «беларусізацыя». Азірнемся на 1920 год.

У апаратах Народнага Камісарыяту Асветы (Наркамасветы) і Камісарыяту Земляробства (Наркамзем) ствараліся гурткі па вывучэнню беларускай мовы для супрацоўнікаў. Праўда, глыбока беларуская мова ў іх дзейнасць так і не ўкаранілася, гурткі неўзабаве распаліся.

Больш грунтоўна і адказна за беларусізацыю ўзяліся адразу пасля адпаведных пастаноў і рэзалюцый II сесіі ЦВК БССР і Пленума ЦК КП(б)Б. У іх былі акрэслены асноўныя задачы па беларусізацыі ўсіх сфер жыцця грамадства, вызначаны канкрэтныя тэрміны (ад года да пяці) пераводу апаратаў усіх устаноў рэспублікі на беларускую мову. Супрацоўнікі дзяржаўных устаноў павінны былі ведаць або хутка вывучыць і беларускую, і рускую мовы. Згодна з прынятымі рашэннямі, грамадзяне, якія не валодалі адной з вызначаных моў, не прымаліся на службу ў дзяржаўныя, грамадскія, прафесійныя арганізацыі і ўстановы Беларускай ССР. У выключных выпадках узятыя на службу без ведання моў карэнных нацыянальнасцей Беларусі былі строга абавязаны вывучыць іх на працягу шасці месяцаў.

Далёка не паўсюдна распрацаваныя тэрміны беларусізацыі вытрымліваліся, а планы паспяхова выконваліся. Так, у 1925 годзе на адным з Пленумаў ЦК КП(б)Б было падкрэслена, што «у рабоце па беларусізацыі савецкага, прафесійнага, кааперацыйнага апаратаў няма дастатковай планамернасці», акрамя таго «яшчэ не зломлены рэзкаадмоўныя адносіны да беларускай мовы з боку старога рускага чыноўніцтва, якое знаходзіцца на службе ў савецкім апараце».

Аднак многія партыйныя і савецкія органы беларусізаваліся амаль поўнасцю на працягу 1924—1926 гадоў. Скажам, апарат СНК, ЦВК, Наркамасветы. Некалькі адставалі Наркамзем і Наркам Унутраных спраў, дзе працэнт беларусізацыі складаў адпаведна 50 і 30. Прычым савецкія органы ўлады ў сярэдзіне 20-х гадоў хутчэй і больш паспяхова выканалі задачы беларусізацыі, чым выканаўчыя ўстановы. Больш таго, колькасць супрацоўнікаў-беларусаў у раённых і акруговых выканаўчых камітэтах рэспублікі за перыяд з 1925 па 1927 гады нават скарацілася, тады як наадварот у гэты час у саставе гарадскіх і сельскіх саветаў беларусы завалодвалі ўсё новыя пасады.

Вядома, што разам з беларусізацыяй у 20-я гады ажыццяўлялася і каранізацыя апаратаў розных устаноў, сутнасць якой заключалася ў вылучэнні ва ўстановы, арганізацыі грамадзян карэнных нацыянальнасцей рэспублікі, прычым пераважна з рабочых і сялян. Натуральна, часцей за ўсё на службу прымалі працаўнікоў-беларусаў, як прадстаўнікоў найбольш шматлікай нацыянальнасці БССР. Галоўным патрабаваннем да работнікаў пры прыёме на службу з'яўлялася веданне імі дзяржаўных моў і асаблівасцей сацыяльна-эканамічнага і культурнага жыцця Беларусі.

Аднак недзе ў канцы 20-х гадоў колькасць беларусаў у некаторых установах рэспублікі пачынае змяншацца. Такая сітуацыя стваралася штучна, нярэдка сілавымі, адміністрацыйнымі метадамі. У гэты час зноў павялічваецца вылучэнне на працу ў органы ўлады ў большасці прадстаўнікоў рускай і яўрэйскай нацыянальнасцей. Такое наўмыснае скажэнне палітыкі беларусізацыі з'яўлялася сумным следствам актывізацыі раптоўнай барацьбы з так званым «беларускім буржуазным нацыянал-дэмакратызмам».

У мэтах супрацьпастаўлення падыходаў да праблем нацыянальнай палітыкі ў БССР трэба заўважыць, што тыя каманднa-адміністрацыйныя метады правядзення мерапрыемстваў урада рэспублікі, якія значна пашырыліся ў канцы 20-х — пачатку 30-х гадоў, у папярэдні час амаль не мелі месца. Варта падкрэсліць пры гэтым хаця б той факт, што па закону, прынятаму ў 1926 годзе, за два гады з нагоды «ўпартага адмаўлення вывучаць беларускую мову», у межах усёй Беларускай ССР было звольнена са сваіх пасад усяго толькі 27 адказных прадстаўнікоў розных устаноў, сярод якіх большасць складалі асобы з расійскага чыноўніцтва, якія варожа ставіліся да беларускай культуры і мовы.

У сярэдзіне — другой палове 20-х гадоў асноўнымі метадамі ўздзеяння на пасіўных грамадзян рэспублікі з'яўляліся шырокая агітацыя і прапаганда мэт і задач беларусізацыі, а не меры прымусовага націску, якія ўсё часцей і часцей прымяняліся з канца 20-х гадоў. Натуральна, што з адыходам ад галоўных прынцыпаў беларусізацыя ў той час у большасці ўстаноў праводзілася павярхоўна і фармальна, а неўзабаве была згорнута. Таму зразумела, што ў гістарычных крыніцах канца 20-х — пачатку 30-х гадоў радавыя, сумленныя супрацоўнікі розных устаноў называюць беларусізацыю «папяровай», бо яна адбывалася толькі на паперы, у выглядзе шматлікіх справаздач, пратаколаў, а на практыцы рэальна ў справе беларусізацыі нічога не рабілася.

Прычым у гэты перыяд нізавы савецкі і партыйны апарат працаваў амаль выключна на беларускай мове, таму што ў мястэчках і вёсках значна пераважала колькасць беларусаў. Адначасова ў вышэйшых звеннях савецкага апарату ў пачатку 30-х гадоў ужыванне беларускай мовы было недастатковым і зусім не пашыралася. У рэзалюцыі Пленума ЦК КП(б)Б (кастрычнік 30-га года) «Аб нацыянальным пытанні» адзначалася, што «у шэрагу ўстаноў беларусізацыя абмяжоўваецца толькі фармальным вядзеннем справаводства на беларскай мове, у той час, як самі адказныя работнікі работы на гэтай мове не вядуць і яе не ведаюць». А, напрыклад, у пастанове Бюро ЦК КП(б)Б аб стане беларусізацыі савецкага, гаспадарчага і прафесіянальнага апарату (кастрычнік 1929 г.) былі названы канкрэтныя ўстановы, якія не выканалі адпаведных дырэктыў партыі і ўраду рэспублікі: «...трэба адзначыць фармальныя адносіны і адставанне ў тэмпах беларусізацыі ў шэрагу савецкіх устаноў, такія як ЦСУ, Дзяржплан, НК аховы здароўя, Наркамгандаль, Наркамфін, Дзяржбанк...» Больш таго, з канца 20-х гадоў іншы раз назіраліся выпадкі не толькі слабага ўкаранення беларускай мовы ў розных органах, установах, але і свядомай іх дзейнасці ў адваротным напрамку.

Беларусізацыя кіруючых устаноў БССР мела нясканчаны, нярэдка вельмі павярхоўны характар. Недзе з канца 20-х гадоў пачаўся працэс скажэння пачатковага сэнсу беларусізацыі.

Э. ДУБЯНЕЦКІ,
навуковы супрацоўнік
НДЛ гісторыі БССР.

# Закон дарогі

Не змяшчаюць «Правілы дарожнага руху» спрадвечнай фармулёўкі — «палюбі блізкага свайго».

Сярод папярэджваючых знакаў таксама не прадугледжана шыльдачкі «Асцярожна: небяспечны вадзіцель (або пешаход)!». Дарэмна... Бо толькі ў снежні мінулага года ў Мінску адбылося 65 дарожна-транспартных здарэнняў, якія загубілі жыццё 9 чалавек. Сумны вынік 1990 года — 669 здарэнняў з пацярпеўшымі (загінула 89 чалавек, паранена 660). Прычым у імкненні парушыць галоўны закон дарогі перамаглі пешаходы з лікам 360:309.

У тры месяцы пазбаўлення права ваджэння аўтамабілем абышлося выкладчыку універсітэта М. М. Басенкову сутыкненне, што адбылося па яго віне. Аштрафаваны на 30 рублёў за грубае парушэнне ПДР студэнт А. Сасімовіч.

А ўсім астатнім ўдзельнікам дарожнага руху няблага было б засвоіць асноўны закон чалавечага жыцця: больш увагі да тых, хто побач.

А. СЛЕСАРЭНКА.

## БЕЗ ВІЗЫ

# Адукацыя па-іарданску

Спачатку пра школу. Калі вам споўнілася шэсць гадоў, уваход у вучэбныя класы вам не забаронены. Тэрмін навучання — дванаццаць гадоў, але праз дзевяць кожнаму вучню патрэбна зрабіць выбар: сярод некалькіх спецыялізаваных праграм адшукаць сваю. Вышэйшая адзнака за дзяржаўны экзамен — «сотка». І калі вынікі экзаменаў супадаюць з патрабаваннямі вышэйшай навучальнай установы, выпускнік аўтаматычна становіцца студэнтам аднаго з трох дзяржаўных універсітэтаў. А ёсць яшчэ і прыватны.

За чатыры гады вучобы студэнты раскашэльваюцца на курсы лекцый і экзамены. Выключэнне складаюць, праўда, дзеці работнікаў дзяржаўных арганізацый, якія нават атрымліваюць стыпендыю.

Інстытуты ў Іарданіі маюць больш вузкую спецыялізацыю. Імі завалодваюць тыя, хто не можа пахваліцца фінансавым дабрабытам. Вучэнне — святло, але ж гэта не значыць, што яно дапаможа вам хутка знайсці месца пасля заканчэння ВНУ. У маленькай Іарданіі адукацыйны ўзровень складае 93 працэнты насельніцтва. Таму моладзь вымушана шукаць работу за мяжой. У асноўным у Іраку, Саўдаўскай Аравіі, Кувейце, ЗША, Арабскіх Эміратах. Ёсць і яшчэ адно выйсце: вучыцца выдатна, каб застацца працаваць на радзіме.

АЛЬ-АТУМ ГАНДЗІ,
студэнт 3-га курса
міжнароднага аддзялення
факультэта журналістыкі.

## СЛУЖБА 03

# А і В сядзелі на градзе

Чалавек у працэсе эвалюцыі страціў здольнасць да інстыктыўнага рацыянальнага харчавання. Што такое абстрактныя бялкі, тлушчы, вугляводы, пра якія так улюбёна распавядаюць урачы? Складаемыя жыцця арганізма.

Бялкі — дэфіцытны ў наш час будаўнічы матэрыял для клетак і тканак. У іх складзе амінакіслоты, якіх няма ні ў тлушчах, ні ў вугляводах. Найбольш карысныя бялкі мяса, рыбы, малака, яек, бульбы, капусты, рысу, грэцкай і аўсянай крупы, соі.

Саграваюць нас тлушчы. Паўнацэннымі з'яўляюцца тлушчы малака, масла, смятанкі, яечнага жаўтка. Таму што яны ўтрымліваюць і некаторыя тлушчараставаральныя вітаміны, неабходныя для жыццяздольнасці арганізма. Вялікае значэнне для здароўя маюць неарганічныя тлушчавыя кіслоты, якія ўтрымліваюцца ў нерафініраваных раслінных маслах, якія садзейнічаюць нармалізацыі абмену рэчываў у арганізме, перашкаджаюць развіццю атэрасклерозу, станоўча ўздзейнічаюць на нервовую сістэму, зніжаюць адчувальнасць арганізма да радыектыўнага апрамянення.

А энергію нясуць вугляводы. Неабходны яны і для цэнтральнай нервовай сістэмы, для работы сэрца. Утрымліваюць вугляводы хлеб, крупы, бульба, гародніна, садавіна...

Вугляводы, тлушчы і бялкі вызначаюць каларыйнасць харчавання чалавека. Іншую ролю адыгрываюць мінеральныя элементы і вітаміны. Са 106 элементаў перыядычнай сістэмы ў арганізме чалавека знойдзена 86, біялагічнае ўздзеянне маюць 65 з іх, а 12 з'яўляюцца жыццёва неабходнымі, таму што задзейнічаны ў праходжанні нервовых імпульсаў, тканкавым дыханні. Па высокім утрыманні мікраэлементаў, кабальта, медзі, цынка першае месца займаюць бульба, капуста, буракі, морква, кава, судак. У малінавым соку многа марганца, у абрыкосавым — медзі.

Вітамін А, які садзейнічае нармальнаму росту і развіццю арганізма, добраму зроку і здаровай скуры, утрымлівае сыр, морква, гарбуз. На вітамін бадзёрасці ($B_1$) багатыя арэхі, мяса, бабы, гарох. Вітамін С валодае шматбаковым універсальным дзеяннем. Асабліва многа яго ў ягадах шыпшыны, чорнай парэчкі, у лісце пятрушкі, чырвоным перцу, апельсінах, лімонах.

Вялікую ролю адыгрывае рэжым харчавання. 30 працэнтаў рацыёна на суткі павінна складаць снеданне, 50 працэнтаў — абед, 20 — вячэра. Калі вы жадаеце застацца на ўсё жыццё рухавымі і працаздольнымі — вучыцеся правільна харчавацца.

І. СЯРГЕЕВА,
урач.


## РЭКЛАМА

ФАКУЛЬТЭТ павышэння кваліфікацыі па прыкладной матэматыцы і ЭВМ здае ў арэнду машынны час на персанальных ЭВМ ЕС-1840, ЕС-1841, IBM PC/AT.

Просьба падаваць заяўкі на адрас: вул. Бабруйская, 9, пакой 72. Тэлефон для даведак 20-60-46.

## ЗАЛІКОЎКА ДЛЯ ВЫКЛАДЧЫКА

# Не сказаўшы «А»...

Выкладчыку прызнацца ў тым, што ён не хоча ставіць студэнтам двоек, бо расчараваўся ў жаданні апошніх атрымліваць выдатныя веды і капітуляваў,— распісацца ва ўласнай бездапаможнасці. Страціўшы ўсялякую надзею на пацвярджэнне чутак, быццам у экзаменатараў прапаў інтарэс да нездавальняючых адзнак, я накіравалася ў вучэбны аддзел, мяркуючы тут атрымаць «кампрамат» на выкладчыкаў.

— Наўрад ці я чым-небудзь дапамагу вам,— заўважыў загадчык аддзела В. М. Цясленка.— Як ні сумна, але крывая паспяховасці з кожным годам няўхільна падае ўніз, так што наўрад ці выкладчыкі сталі больш лаяльна ставіцца да студэнтаў. Калі ў 1985—86 навучальным годзе непаспяваючых студэнтаў па выніках зімовай экзаменацыйнай сесіі было ўсяго 8,6 працэнта, то ў 1988—89 гэты паказчык дасягнуў ужо 12,37, а ў 1989—90—14,2 працэнта. Захоўвае «традыцыі» і летняя сесія. У апошнім семестры мінулага навучальнага года колькасць непаспяваючых перавысіла 13 працэнтаў.

Міжволі паўстае пытанне: у чым прычыны зніжэння паспяховасці? Іх шмат. Гэта і зніжэнне якасці падрыхтоўкі выпускнікоў сярэдніх школ, што істотна ўплывае на паспяховасць першакурснікаў, і падзенне прэстыжу вышэйшай адукацыі ў нашай краіне, якое прывяло да зніжэння конкурсу на многія спецыяльнасці. Адной з галоўных прычын начальнік вучэбнага аддзела назваў павышэнне патрабавальнасці да студэнтаў з боку выкладчыкаў. Так што, інтарэс да двоек не толькі не ўпаў, але наадварот падняўся.

Аднак, думаецца, трэба глядзець глыбей. Галоўнай прычынай зніжэння паспяховасці, з'яўляецца адсутнасць у нас культа вучобы як працы, нізкі ўзровень свядомай вучэбнай дысцыпліны. Пры ранейшай сістэме размеркавання многія студэнты лічылі пяць гадоў вучобы ў вышэйшай навучальнай установе апошнімі шчаслівымі гадамі перад «вечнай катаргай» — работай. Кожны з выпускнікоў ведаў, што месцам ён у любым выпадку будзе забяспечаны і сваю жабрацкую першапачатковую зарплату таксама атрымае, незалежна ад таго, як вучыўся на працягу пяці гадоў.

Дзеля справядлівасці варта спытаць: а ці толькі студэнты вінаваты ў вялікіх працэнтах непаспяваючых? Уявіце самі: адміністрацыя навучальнай установы прадастаўляе студэнтам магчымасць самім вырашаць, на якія прадметы хадзіць, а на якія не. І яны робяць выбар — з усяго курса на іншай лекцыі прысутнічае чалавек дзесяць-пятнаццаць. Астатнія вырашылі, што свабоднае наведванне — гэта проста афіцыйная магчымасць адпачыць у час вучэбных заняткаў. Кіраўніцтва факультэтаў павінна было прадбачыць, што не многія кінуцца ў чытальныя залы, і наладзіць кантроль за самастойнай работай, аднак ён адсутнічае і сёння.

Можна паглядзець на праблему паспяховасці і з іншага боку: 13,5 працэнта непаспяваючых за апошнюю сесію — многа гэта ці мала? Наўрад ці хто будзе катэгарычным у адказе. Напэўна, не існуе ніводнай ВНУ ў свеце, дзе б паспяховасць была стопрацэнтнай. Наўрад ці магчыма знайсці курс зусім аднолькавых па здольнасцях і жаданню вучыцца студэнтаў. Таму выкладчык заўсёды атранжырue іх па ўзроўню ведаў і на любым курсе абавязкова будуць і выдатнікі, і двоечнікі. Праўда, на першым і другім іх звычайна больш, а на старэйшых менш. Чаму так здараецца? Адказ просты: першакурснік падобны да чалавека, які не ўмее плаваць, а яго наўмысна кінулі ў ваду.

### КАБ ВЫПЛЫЦЬ, ТРЭБА НАВУЧАЦЦА ПЛАВАЦЬ

Спачатку многія былі супраць: ён не мае права свавольнічаць. Некаторыя не разумелі: навошта ствараць сабе дадатковыя цяжкасці — іх і так хапае. Чым шукаць задачы і састаўляць заданні, ці не лепш узяць ужо гатовыя білеты і прымаць экзамены, як усе — вусна. Але для дацэнта кафедры вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі фізічнага факультэта А. А. Чупрыгіна гэта не пераканаўча. Ён, як і раней, упэўнены, што экзамены павінны праводзіцца абавязкова ў пісьмовай форме. Толькі так мы здолеем дабіцца сапраўднай аб'ектыўнасці ў ацэнцы ведаў студэнтаў.

Праўда, у правіле яго ёсць выключэнне — гэта першакурснікі. Менавіта Алег Аляксандравіч першым пакідае ў іх залікоўках свой аўтограф.

— Шчыра скажу: вельмі незайздроснае ў мяне становішча,— спрабуе растлумачыць стан сваёй душы А. А. Чупрыгін пасля экзамена ў студэнтаў першага курса.— У нас на факультэце практычна няма першакурснікаў, якія маюць у атэстаце па фізіцы тройкі. У школе яны прывыклі атрымліваць «чатыры» і «пяць» і ўпэўнены, што іх веды па дадзенаму прадмету адпавядаюць адзнацы. І калі я бачу, што студэнт не ведае білет, пачынае «плаваць», я павінен не проста паставіць двойку, а пераканаць яго, што нешчаслівы білет тут ні пры чым, а ён проста не засвоіў матэрыял і ў наступны раз абавязкова будзе адказваць значна лепш.

Так, гэта галоўнае — не расчараваць чалавека. Да таго ж Алег Аляксандравіч перакананы, што калі на экзамене студэнт маўчыць і не можа вымавіць ні слова, то гэта яшчэ не значыць, што ён не жадае вучыцца. Цікавае, на яго думку, даследаванне правялі ў Маскоўскім медыцынскім інстытуце. Напярэдадні экзамена ў студэнтаў знялі кардыяграму сэрца. Вынікі яе не былі нечаканасцю для медыкаў, затое студэнтаў яны вельмі напалохалі: прыкладна ў 50 працэнтаў з іх быў перадінфарктны стан. Прычым, кардыяграма не залежала ад узроўню ведаў: сярод «кандыдатаў у інфарктнікі» былі і выдатнікі, і двоечнікі.

Нарэшце, білет у руках — і наступае часовае супакаенне, асабліва, калі студэнт бачыць, што ведае яго. Ён сядзіць, уважліва слухае адказы таварышаў і матае на вус пытанні, якімі быццам хоча «ўтапіць» яго сябра выкладчык. Адно, другое, трэцяе — гэта ён таксама ведае. І вось тое, на якое ён наўрад ці зможа адказаць. Яно і з'яўляецца прычынай другога перадінфарктнага стану. А калі ўлічыць, што за гады вучобы студэнт здае прыкладна сорак экзаменаў, можна ўявіць, з якім здароўем ён уступіць у працоўнае жыццё.

Каб студэнт менш перажываў такіх вось стрэсаў, А. А. Чупрыгін вырашыў праводзіць замест вуснага экзамена пісьмовы. Дарэчы, такая практыка існуе ва ўсім свеце. Алег Аляксандравіч сам падбірае заданні (яны разлічаны не на выдатніка, а на сярэдняга студэнта). Кожнаму іх выпадае прыкладна пяць. Ёсць магчымасць падумаць і над дадатковымі пытаннямі —яны таксама запісаны ў заданні. Экзаменатар упэўнены, што за чатыры акадэмічныя гадзіны чалавек здолее сканцэнтраваць сваю ўвагу, засяродзіцца, супакоіцца і справіцца з заданнем. Ва ўсялякім выпадку, калі штосьці і не атрымаецца, то ў яго не складзецца ўражанне, быццам выкладчык прыдзіраецца — менавіта такая рэакцыя ў студэнтаў на дадатковыя пытанні пры вусных адказах.

— Не хачу сцвярджаць, што ўсіх, хто здаваў мне экзамены, я ацаніў аб'ектыўна,— гаворыць А. А. Чупрыгін.— Але ўпэўнены ў адным: наўрад ці хто пакрыўдзіцца на мяне, што занізіў адзнаку. Я ніколі не зраблю гэтага, бо мае студэнты самі ведаюць свае магчымасці — іншы раз я прапаную ім ацаніць уласныя веды. У асноўным яны даволі самакрытычна адносяцца да гэтага, і нашы адзнакі супадаюць.

Шмат гадоў я працую са студэнтамі і зрабіў для сябе вывад: не ставіць студэнту двойку я не маю права (калі ён, натуральна, гэтага не заслугоўвае). Асабліва па матэматыцы. У нас нельга гаварыць «Б», пакуль не сказаў «А». Калі я сёння пастаўлю студэнту, які слаба ведае прадмет, тры, то ў будучым я асуджу яго на двойку. З другога боку, выкладчык не мае права занізіць адзнаку, каб не пазбавіць чалавека веры ў тое, што ён нечага варты. Мы павінны вельмі дакладна вызначаць гэту мяжу паміж «здавальняюча» і «нездавальняюча». Гэта наш асноўны абавязак. І ніякія паказчыкі і працэнты не павінны пазбаўляць нас аб'ектыўнасці і прынцыповасці, а студэнтаў — выдатных ведаў.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

## НАДЗВЫЧАЙНАЕ ЗДАРЭННЕ

# Мяняю залік на стыпендыю

Першым у Беларусі паддаўся на правакацыю МРТІ, пратаптаную сцяжынку заўважыў Інстытут культуры... Хто на новенькага?

«Калі ўвядуць плату за ліквідацыю акадэмічных запазычанасцей...» Адны мяркуюць, павысіцца паспяховасць. Другія — «цэрберскі» запал выкладчыкаў. Трэція рыхтуюцца пачаць галадоўку ў кабінеце рэктара.

А мы лічым, трэба выконваць галоўную ўмову — паступае ў ВНУ той, хто жадае вучыцца. Тых, каму гэта надакучыла — проста адлічваюць. Нават высакародная мэта — пералічванне грошай ў фонд сацыяльнай абароненасці студэнтаў — не апраўдвае сродкаў абірання няўдачнікаў. Тым больш, што яшчэ ні ў аднаго студэнта не атрымлівалася ў часы бясплатнай адукацыі пражыць, разлічваючы толькі на стыпендыю. А калі працуеш, гэта таксама ўплывае на якасць вучобы. І потым, абыякавымі могуць быць не толькі студэнты. Многія дрэнна падрыхтаваны да экзамена з-за неахайнасці выкладчыкаў. У такім разе давайце ўводзіць штрафы, калі перад выпускніком паўстануць пытанні, у якіх ён некампетэнтны.

Між іншым, Ф. Сталярэнка, намеснік начальніка галоўнага эканамічнага ўпраўлення Дзяржадукацыі СССР лічыць «прэйскурантную» сесію парушэннем канстытуцыйных правоў. Незразумелая да таго ж залежнасць павышэння ведаў студэнтаў ад таўшчыні іх кашалькоў.



## ЧАС-ПІК

# ПРЫЕМНЫХ СНОЎ!

Ну, праспаць і прапусціць лекцыю — яшчэ куды ні ішло. Але не з'явіцца на залік ці экзамен?! Цяпер — калі ласка. Завітайце на любы факультэт (асабліва гуманітарны) і вы абавязкова сустрэнеце «спячую прыгажуню» (гарантую: мужчынскі пол не выключэнне).

Акурат такі нясмела таптаўся ў прыёмным пакоі дэкана геаграфічнага факультэта. Відаць, у «начальства» ён ужо пабыў і зараз не ведаў, што рабіць.

Сітуацыя з экзаменацыйнай сесіяй на факультэце сапраўды складаная. Асабліва на другім і трэцім курсах. Гартаючы журнал уліку паспяховасці, дзіву давалася: з групы, у якой 24 чалавекі, да першага экзамена было дапушчана... толькі пяць. Насупраць астатніх прозвішчаў — літара «н». Гэта значыць, забыліся на залікі — можаце спаць і далей.

Праўда, некаторыя студэнты пачалі паціху прачынацца, відаць, адчулі, што такі моцны сон можа пазбавіць іх і таго, дзеля чаго так імкнуліся стаць студэнтамі БДУ — дыплома.

— Раней хоць матэрыяльны (пра маральны і гаворкі няма) стымул крыху падбадзёрваў студэнтаў,— лічыць памочнік дэкана геафака В. М. Каштанаў.— Што ні кажы, а калі паўгода не атрымаеш стыпендыю раз, другі, ужо не толькі сорамна ў бацькоўскую кішэню залазіць, але і перад сябрамі ніякавата. Зараз жа мы можам пазбавіць студэнта стыпендыі толькі да моманту ліквідацыі запазычанасцей. Агораў так-сяк незалікі — і атрымлівай грошы. Дык навошта, скажыце, студэнту перанапружвацца ў час сесіі і здаваць праз дзень-другі экзамены? Ён лепш аблегчыць свой лёс і няхай потым выкладчык дзеля двух-трох хвасцістаў штодня ходзіць на экзамены.

Нельга не пагадзіцца з разважаннямі Вадзіма Міхайлавіча. Не надта вясёлыя яны, бо завалодвае думкамі апасенне: ці можа стаць студэнт выдатным спецыялістам, калі на працягу семестра не наведаў ніводнага семінара?

Ці толькі студэнт вінаваты ў гэтым? Далі ім свабоду і забыліся паклапаціцца аб кантролі за ведамі. Які б свядомы ні быў студэнт, а бескантрольнасць зробіць сваю справу.

А пакуль хочацца пажадаць студэнтам: «Прыемных сноў у час сесіі!». Пачакайце, а пра ўмову забыліся: вы абавязкова павінны быць вундэркіндамі і ўмець засвойваць веды ў сне.





«Дзе гэта фотакарэспандэнту ўдалося «схапіць» такі кадр?»— здзівіцеся вы, убачыўшы на здымку занятых сваёй справай студэнтаў, зазначыўшы пра сябе, што апошнім часам такая масавасць — вялікая рэдкасць. Асабліва на лекцыях. Не будзем пярэчыць — заўвага ваша сапраўды слушная. Але ж не ўсё кату масленіца.

Нават студэнтам, якія ад сесіі да сесіі жывуць весела, часам здараецца папрацаваць. Ці то ад перанапружання, ці яшчэ з якой нагоды, у галаву пачынаюць лезці «дурныя» думкі: «Усё, з наступнага семестра пачынаю сістэматычную вучобу. Хопіць бяссонных начэй у час сесіі, за якія не паспяваеш нават «шпоры» напісаць, і дрыжыкаў на экзаменах: хоць бы не выцягнуць, што не паспеў прачытаць. Буду ўсё рабіць своечасова, каб потым не сядзець у чыталцы ад адкрыцця да закрыцця...»

Спадзяёмся, на гэты раз вы стрымаеце свае абяцанні самому сабе. Мы не памыляемся?

Фота С. ВАСІЛЬЕВА.

## ЛІСТ З РЭДАКЦЫІ

# Ваш сябар — «Беларускі універсітэт»

На старонках газеты, дзе публікуюцца Вашы лісты, маюць права на існаванне самыя палярныя погляды.

«Беларускі універсітэт» заўсёды радуецца атрыманаму чытацкаму лісту. У ім абавязкова павінен быць подпіс аўтара, яго адрас і нумар тэлефона.

Рэдакцыя захоўвае за сабой права рэдагаваць усе лісты па выразнасці выкладання, граматыцы, памерах.

КАЛІ

— Вам трэба павіншаваць з днём нараджэння добрага знаёмага, набыць, прадаць ці памяняць якую-небудзь рэч;

— Вы маеце патрэбу ў рэкламе,«Беларускі універсітэт» забяспечыць Вам уважлівую да інфармацыі аўдыторыю сваіх чытачоў.

НАШ АДРАС: ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9. ЧАЦВЁРТЫ ПАВЕРХ, ПАКОІ 74, 75, ТЭЛ. 20-68-27.


## ДЗЕЛАВОМУ ЧАЛАВЕКУ

# «Маладзёжны цэнтр «Альянс»

прапануе свае паслугі і гатовы да супрацоўніцтва ў распрацоўцы, вырабе і ўкараненні рознай навукова-тэхнічнай прадукцыі.

СПЕЦЫЯЛІСТЫ ЦЭНТРА:

— заключаць дагаворы з ВТК на правядзенне навукова-даследчых работ на ўзаемавыгадных умовах (як па дзяржаўных, так і па дагаворных цэнах);

— выканаюць праектна-канструктарскія, інфармацыйна-вылічальныя, рэкламныя работы;

— ажыццявяць пастаўку, наладку і запуск вылічальнай тэхнікі і сродкаў аўтаматызацыі (магчыма пастаўка і ўкараненне ПТК на базе ЭВМ тыпу IBM PC);

— дапамогуць у пошуку заказчыкаў і зробяць маркетынг Вашай прадукцыі;

— выканаюць дэкаратыўна-апрацоўчыя работы і вырабяць мэблю як са свайго матэрыялу, так і з матэрыялу заказчыка;

— акажуць паслугі ў пракаце, рэалізацыі і распаўсюджанні аўдыя- і відэапрадукцыі,у правядзенні тэматычных вечароў;

— прымуць заяўкі на правядзенне тэматычных вечароў адпачынку, студэнцкіх вяселляў у маладзёжным кафе «Гаўдэамус» і клубе «Палітыкус».

АДРАС МАЛАДЗЁЖНАГА ЦЭНТРА «АЛЬЯНС»: 220080, Г. МІНСК, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 4, ГАЛОЎНЫ КОРПУС УНІВЕРСІТЭТА, ПАКОЙ 311.

ТЭЛЕФОНЫ: 20-66-85, 26-57-13 — ПРЫЁМНАЯ (НАЙДЗЕН ЛАРЫСА ДЗМІТРЫЕЎНА); 20-96-13 — бухгалтэрыя.

ЦЭНТР «АЛЬЯНС» — ВАШ НАДЗЕЙНЫ ПАРТНЁР!

